BELARUS Live
NEWSLETTER
02/11-08/11/07

**ПАЛІТЫКА**
▪Новыя санкцыі супраць Беларусі

**АФІЦЫЙНА**
▪Беларусь папрасіла ў Вэнэсуэлы крэдыт

**АПАЗЫЦЫЯ**
▪Па вуліцах Менску прайшоў Сацыяльны марш
▪Апазыцыя плянуе чарговыя пікеты

**ЭКАНОМІКА**
▪Расея не збудуе другой ніткі газаправоду Ямал – Эўропа
▪Беларусь ня зможа гандляваць вэнэсуэльскай нафтай

**ГРАМАДЗТВА**
▪Студэнты ЭГУ ствараюць уласную арганізацыю

**КУЛЬТУРА**
▪Экспазыцыя выяваў беларускіх гістарычных дзеячоў

4 лістапада беларуская апазыцыя правяла ў Менску "Сацыяльны марш". Ставілася на мэце выказаць масавы пратэст супраць скасаваньня льготаў (адпаведны закон быў прыняты на вясновай сэсіі парлямэнту) і пагаршэньня ўзроўню жыцьця. Аднак акцыя, паводле ацэнкі аналітыкаў, атрымалася ня надта ўдалай. У ёй прыняло ўдзел прыкладна паўтары тысячы чалавек (для параўнаньня: у "Эўрапейскім маршы" 14 кастрычніка ўдзельнічала 5-7 тысяч чалавек).

Напярэдадні "Сацыяльнага маршу" ўлады правялі традыцыйную "прэвэнтыўную зачыстку" (шэраг актывістаў былі арыштаваныя), канфіскоўваліся інфармацыйныя матэрыялы, міліцыя перашкаджала выезду апазыцыянэраў з рэгіёнаў для ўдзелу ў мерапрыемстве. Разам з тым, непасрэдна падчас акцыі і пасьля яе затрыманьняў не было. Група моладзевых актывістаў здолела нават прайсьці па галоўным праспэкце да Дому ўраду і разгарнуць там свае лёзунгі. Назіральнікі тлумачаць гэтую адносную мяккасьць уладаў іх жаданьнем "трохі спадабацца Эўропе".

На іх думку, "Сацыяльны марш" атрымаўся нешматлюдным найперш таму, што насельніцтва пакуль што не адчула наступстваў закону аб скасаваньні льгот, бо ён уступае ў сілу толькі ў сьнежні. Тады, у прыватнасьці, студэнты і пэнсіянэры страцяць права на льготны праезд у грамадзкім транспарце. Мяркуецца, што незадаволенасьць электарату можа значна ўзмацніцца да вясны, бо, акрамя таго, у зьвязку з падаражаньнем расейскіх энэрганосьбітаў маюць падвысіцца кошты на жыльлёва-камунальныя паслугі. Таксама імаверны яшчэ болей адчувальны рост коштаў на харчаваньне ды іншыя тавары. Варта зазначыць, што апошнім часам ужо падаражэлі малочныя прадукты, узьнік дэфіцыт некаторых зь іх, дый наагул інфляцыя, на думку незалежных эканамістаў, перавышае афіцыйныя лічбы.

Разам з тым, што да "Сацыяльнага маршу", дык аналітыкі зьвяртаюць увагу і на хібы самой апазыцыі. У шэрагах Аб'яднаных дэмакратычных сілаў няма зладжанасьці. Правыя партыі слаба ўдзельнічалі ў падрыхтоўцы акцыі, ініцыяванай найперш левымі сіламі. Ня выявіла высокай актыўнасьці і апазыцыйная моладзь, якая вінаваціць арганізатараў мерапрыемства ў згодніцтве (яны пагадзіліся на маршрут, прапанаваны ўладамі, і ў выніку зладзілі мітынг у аддаленым ад цэнтру парку, які юныя апазыцыянэры грэбліва называюць "пляцоўкай для выгулу сабак"). Слабой, шаблённай выглядала рэкляма маршу.

Між тым улады правялі 1—2 лістапада I зьезд навукоўцаў Беларусі. У сваёй прамове на форуме прэзыдэнт Аляксандар Лукашэнка засяродзіў увагу на неабходнасьці інавацыйнага

разьвіцьця краіны. Зь ягоных слоў, настаў час болей сувора спагнаць з навукоўцаў за эканамічны эфэкт іхных распрацовак.

На думку палітоляга Валера Карбалевіча, гэтая задача ня мае вырашэньня ў межах створанай у краіне сацыяльна-эканамічнай мадэлі, бо "галоўная праблема палягае ў тым, што Акадэмія навук і ўсе астатнія навуковыя ўстановы існуюць у нярынкавым, неканкурэнтным асяродзьдзі. У такой сытуацыі Нацыянальная акадэмія навук ня можа быць ні чым іншым, як тыповай савецкай установай, што функцыянуе ва ўмовах напалову сацыялістычнай эканомікі з усім яе "хараством"... У такой сыстэме адзнаку навуковаму прадукту дае ня рынак, а бюракрат, цэніцца не таленавіты навуковец, а чалавек, зручны для кіраўніцтва". Красамоўны штрых: паводле зьвестак незалежных мэдыяў, тэксты выступаў на зьезьдзе папярэдне ўзгадняліся з кіраўніцтвам Акадэміі навук (на яе чале з 2002 году стаіць прызначаны ўказам прэзыдэнта экс-кіраўнік ягонай адміністрацыі Міхаіл Мясьніковіч).

Былы прэзыдэнт Акадэміі навук і цяперашні апазыцыянэр Аляксандар Вайтовіч згадвае, што ў свой час, пры канцы 1990-х, ён клаў на стол кіраўніцтву краіны прапановы адносна інавацыйнага разьвіцьця, стварэньня парку высокіх тэхналёгіяў, выкарыстаньня мясцовых відаў паліва. Зь ягоных слоў, тады кіроўныя вярхі ніяк не адрэагавалі, бо спадзяваліся на працяг эканамічных датацый, і найперш — пастаўку танных энэрганосьбітаў з боку Расеі. У выніку адпаведная стратэгія асэнсоўваецца на дзяржаўным узроўні зь вялікім спазьненьнем. Звыш таго, лічыць акадэмік Вайтовіч, у краіне праз анахранічную сыстэму кіраваньня па-ранейшаму няма эканамічных і палітычных умоў для інавацыйнага разьвіцьця.

Між тым Расея мае намер і надалей праводзіць палітыку пераводу дачыненьняў зь Беларусьсю на прагматычныя рынкавыя рэйкі. Гэта падкрэсьліваюць аналітыкі ў сваіх камэнтарах з нагоды прэсавай канфэрэнцыі амбасадара Расеі ў Беларусі Аляксандра Сурыкава 1 лістапада. Ён, у прыватнасьці, ня выказаў упэўненасьці, што Менск атрымае сёлета крэдыт на 1,5 мільярду даляраў, якога дамагаецца ад Масквы з пачатку году ў зьвязку з падаражаньнем энэрганосьбітаў. Звыш таго, Сурыкаў даў зразумець, што расейскі бок ня будзе пракладаць празь Беларусь другую нітку газаправоду "Ямал — Эўропа" (такую прапанову з абяцаньнем ільготаў на транзыт зрабіў нядаўна беларускі прэзыдэнт), бо лічыць за лепшае пабудаваць газаправод "Паўночная плынь", які дазволіць пампаваць газ у Эўропу без пасярэднікаў. Назіральнікі тлумачаць такі выбар Расеі ўрокамі "нафтагазавых войнаў", калі Менск спэкуляваў на пытаньнях транзыту нафты і газу, дамагаючыся танных паставак.

Разам з тым, амбасадар паведаміў аб імавернай сустрэчы беларускага і расейскага прэзыдэнтаў у сьнежні. Некаторыя аналітыкі дапускаюць, што Расея не адмовілася ад плянаў інкарпарацыі Беларусі, і прагназуюць, што на гэтай сустрэчы Лукашэнку можа быць вылучаны ўльтыматум: або ўваход у склад Расеі, або рэзкі рост коштаў энэргарэсурсаў.

---

## ПАЛІТЫКА

## Новыя санкцыі супраць Беларусі

**ЗША намераны ўвесьці новыя санкцыі супраць Беларусі. Пра гэта заявіў намесьнік памочніка дзяржсакратара ЗША Дэвід Крэмэр.**

Яго словы прыводзіць партал “Хартыя 97”. Крэмэр не хацеў удакладніць, якія гэта будуць санкцыі. Сказаў толькі, што пра новыя крокі ЗША супраць Беларусі стане вядома на працягу наступнага тыдня. Увядзеньне санкцыяў абгрунтаванае тым, што ўлады Беларусі не жадаюць вызваляць з турмы палітычных вязьняў.

Дэвід Крэмэр дадаў, што Амэрыка надалей будзе падтрымліваць апазыцыю й грамадзянскую супольнасьць краіны.

“Рэжым Лукашэнкі знаходзіцца пад ціскам з усіх бакоў – ЗША, Эўразьвязу, а таксама Расеі – у сувязі з павышэньнем цэнаў на энэрганосьбіты. Трэба паглядзець, якая будзе сытуацыя напачатку наступнага году, калі вырастуць цэны”, – заявіў намесьнік памочніка дзяржсакратара ЗША

## АФІЦЫЙНА

### Беларусь папрасіла ў Вэнэсуэлы крэдыт

**Беларусь папрасіла ў Вэнэсуэлы крэдыт у сувязі з ростам цаны на энэрганосьбіты. Просьба была перададзеная Міністэрству фінансаў Вэнэсуэлы ў часе нядаўняга візыту беларускай дэлегацыі ў Каракас.**

Часовы Паверааны Вэнэсуэлы ў справах Беларусі Амэрыка Дыяс Нуньес адзначыў, што Вэнэсуэла й Беларусь зьўляюцца блізкімі сябрамі, а “між сябрамі мусіць існаваць рэальная, а не дэкляраваная салідарнасьць.

## АПАЗЫЦЫЯ

### Па вуліцах Менску прайшоў Сацыяльны марш

**У нядзелю, 4 лістапада, апазыцыйныя сілы Беларусі арганізавалі Сацыяльны марш. Асноўная мэта акцыі – выказаць пратэст супраць ліквідацыі льгот для некаторых катэгорый грамадзян, пагаршэньня жыцьця ды кантрактнай сыстэмы працаўладкаваньня.**

Удзел у акцыі прыняло, паводле розных ацэнак, ад некалькіх сот да 1,5 тыс. чалавек. Завяршальным момантам Сацыяльнага маршу стаў мітынг у парку Дружбы народаў.

Падчас руху калёны адбыўся інцыдэнт – узьнікла бойка паміж анархістамі й чальцамі ўльтраправай арганізацыі “Белая воля”. Як лічыць старшыня арганізацыйнага камітэту маршу Валеры Ухналёў з Партыі камуністаў Беларускай, бойка была правакацыяй беларускіх спэцслужб.

Акцыя апазыцыі была дазволена ўладамі. Праваахоўныя органы ня ўмешваліся ў ход мерапрыемства.

### Апазыцыя плянуе чарговыя пікеты

**Закон „Аб дзяржаўных сацыяльных ільготах, правах і гарантыях для асобных катэгорыяў грамадзянаў” уступіць у сілу 17 сьнежня. У гэты дзень беларуская апазыцыя плянуе правесьці каля палутара тысяч сацыяльных пікетаў па ўсёй краіне.**

У дадзены момант апазыцыйныя дзеячы зьбіраюць подпісы пад зваротамі да дэпутатаў мясцовых органаў улады з патрабаваньнем даць справаздачу пра сваю дзейнасьць і патлумачыць, чаму яны прагаласавалі за адмену льготаў.

## ЭКАНОМІКА

### Расея не збудуе другой ніткі газаправоду Ямал – Эўропа

**Няма падставаў да будаўніцтва праз Беларусь другой ніткі газаправоду Ямал – Эўропа – заявіў міністар прамысловасьці й энэргетыкі Расеі Віктар Хрысьценка. Беларускія ўлады выступілі з прапановай такога праекту як альтэрнатывы пабудове трубаправоду па дне Балтыйскага мора.**

Беларусь абяцае Маскве значныя льготы на транзыт газу цягам 5 гадоў, калі Расея пагодзіцца цягнуць другую нітку па яе тэрыторыі.

### Беларусь ня зможа гандляваць вэнэсуэльскай нафтай

**Беларускі бок падпісаў дамову на здабычу вэнэсуэльскай нафты, але ня зможа самастойна ёй гандляваць – паведамляе партал bdg.by.**

Умовы дамовы пракамэнтаваў прадстаўнік канцэрну “Белнафтахім” Браніслаў Сівы.

Ён патлумачыў, што ў сумеснай кампаніі Вэнэсуэла будзе мець 60% акцый. Згодна з

гэтай прапорцыяй будзе дзяліцца прыбытак ад продажу сыравіны. Паводле вэнэсуэльскіх законаў экспартам нафты можа займацца толькі Нацыянальная кампанія нафты. Такім чынам, уся здабытая беларусамі нафта будзе належаць вэнэсуэльскаму боку, а Беларусь атрымае толькі сваю частку дывідэндаў.

Беларусь здаўна вядзе працу па стварэньні сумеснага прадпрыемства з нафтавай кампаніяй Вэнэсуэлы. Абраныя ўжо пляцоўкі для здабычы сыравіны, падрыхтаваны бізнэс-плян і праект дамовы аб здабычы нафты й падзеле прадуктаў здабычы. Магчыма, пакет дакумэнтаў будзе падпісаны падчас бліжэйшага візыту прэзыдэнта Лукашэнкі ў Вэнэсуэлу.

## ГРАМАДЗТВА

### Студэнты ЭГУ ствараюць уласную арганізацыю

**Эўрапейскі гуманітарны ўнівэрсытэт дзейнічае ў выгнаньні ўжо трэці год. Сытуацыя ў Рэспубліцы Беларусь, на жаль, не дазваляе спадзявацца, што хутка студэнты вернуцца зь Летувы на айчыну.**

Студэнты ЭГУ вырашылі стварыць уласную арганізацыю – Аб’яднаньне студэнтаў – гаворыць ініцыятар стварэньня аб’яднаньня Кірыл Атаманчык.

К. Атаманчык: Я высунуў ініцыятыву ў Студэнцкае самакіраваньне, каб заснаваць такое аб’яднаньне. Думаю, што студэнты зразумеюць – Эўрапейскі гуманітарны ўнівэрсытэт ужо вырас, у яго вялікая структура – 500 чалавек. Гэта вялізнае поле для працы. Спадзяюся, што студэнты праявяць актыўную грамадзянскую пазыцыю.

Кірыл Атаманчык зьяўляецца актывістам “Маладога фронту”, за гэтую дзейнасьць у Беларусі на яго была заведзена крымінальная справа. Але ў Летуве хлопец таксама актыўна дзейнічае – Аб’яднаньне студэнтаў ЭГУ ён намераны зарэгістраваць у Мінюсьце краіны.

## КУЛЬТУРА

### Экспазыцыя выяваў беларускіх гістарычных дзеячоў

**У бібліятэцы журфаку БДУ адкрылася выстава партрэтаў гістарычных і культурніцкіх дзеячоў Беларусі. На палотнішчах выявы Эўфрасіньні Полацкай, Барбары Радзівіл, Тадэвуша Касьцюшкі, Міколы Гусоўскага і іншых дзеячоў – усяго 25 асобаў.**

Выстава зьмяшчае працы Зьмітра Шапавалава й Валянціна ды Ляілі Варэцаў.

Мастакі й іх калегі правялі дасьледніцкую працу па абліччах гістарычных дзеячоў Беларусі, а для кожнай асобы быў выбраны найбольш верагодны зьнешні выгляд. На некаторых літаграфіях адлюстраваныя выявы родавых і ўласных пячатак, гербаў гарадоў, зь якімі зьвязаны лёс герояў экспазыцыі.

Belarus live

polishaid

Існуе шмат сайтаў, прысьвечаных падзеям у Беларусі, аднак яны малавядомыя ў Заходняй Эўропе, асабліва тым, хто займаецца фармаваньнем палітыкі адносна Беларусі й ня ведае беларускай ды расейскай моваў.

Сэрвіс belarus-live запаўняе гэты прагал. Штотыднёвую рассылку на ангельскай, польскай, беларускай ды расейскай мовах можна замовіць на сайце.

European Radio for Belarus

Polonia POLSKIE RADIO